Адным з важнейшых напрамкаў дзейнасці масавых бібліятэк Жабінкаўскага раёна з’яўляецца работа ў дапамогу нацыянальнаму адраджэнню. Гэта знайшло адлюстраванне як у знешнім афармленні бібліятэк, так і ў тэматыцы мерапрыемстваў, накіраваных на асэнсаванне гістарычнага шляху беларускага народа, выхаванне гордасці за сваю Бацькаўшчыну, абуджэнне нацыянальнай свядомасці. Усёй сваёй дзейнасцю бібліятэкі імкнуцца ўплываць на развіццё пачуцця дачынення кожнага чалавека да лёсу сваіх землякоў, павагі да мінулага і сучаснага жыцця роднага краю, адказнасці за яго прыроднае і гістарычнае асяроддзе. Увага звяртаецца на малавядомыя старонкі нашай мінуўшчыны, аб чым сведчаць назвы мерапрыемстваў: «Пра час далёкі, летапісны», «Гісторыі таемныя радкі», «Адкуль пайшлі беларусы» і іншыя.

Для больш якаснай арганізацыі работы па нацыянальнаму адраджэнню, у 1989 годзе савет Жабінкаўскага аддзела культуры зацвярдзіў Мерапрыемствы па рэалізацыі комплекснай праграмы захавання і прапаганды культурнай спадчыны беларускага народа «Спадчына», якая дзейнічала да 1997 года. З 1997 года мы працуем па дапоўненай праграме.

У бібліятэках Жабінкаўскай ЦБС сабраны неблагі матэрыял па краязнаўству, які змяшчае як мастацкую, так і галіновую літаратуру пра Беларусь і Брэстчыну ў цэлым. Што датычыцца агульнага краязнаўства, то тут асаблівых праблем не існуе. Але для сельскіх бібліятэкараў сёння самым важным у рабоце з'яўляецца пазнанне свайго краю, сваёй «маленькай радзімы», сваіх каранёў. І тут пачаліся цяжкасці з тым, што матэрыяла аб нашай Жабінкаўшчыне было вельмі небагата. Першай справай, якая дала пэўны штуршок для яго накаплення, было састаўленне гістарычнай даведкі «Жабінка і Жабінкаўскі раён». Для гэтага былі сабраны звесткі з усіх вядомых крыніц, якія маюцца ў абласной і ў раённай бібліятэках. Гэты матэрыял доўгі час выкарыстоўваўся як грамадскімі арганізацыямі, так і бібліятэкамі раёна для правядзення разнастайных мерапрыемстваў. Калі пачаўся збор матэрыялаў па гісторыі роднага краю, былі адрэдагаваны краязнаўчыя картатэкі. Яны сталі папаўняцца больш інтэнсіўна звесткамі аб краязнаўчых матэрыялах, надрукаваных у розных рэспубліканскіх крыніцах. Дапамагла нам у гэтым і руплівая работа ў Нацыянальнай бібліятэцы, архівах Мінска і Брэста па стварэнню раённай кнігі «Памяць», якая нядаўна выйшла ў свет.

У гэты ж час бібліёграф ЦБ пачала складаць інфармацыйныя спісы літаратуры «Жабінкаўскі раён у друку», якія паступаюць ва ўсе сельскія бібліятэкі і з'яўляюцца асновай для папаўнення краязнаўчых картатэк. У дальнейшым гэтая інфармацыя выкарыстоўваецца для правядзення краязнаўчых мерапрыемстваў, афармлення

краязнаўчых куткоў.  Добры даведачны матэрыял сабраны ў буклеце, падрыхтаваным аддзелам бібліятэчнага маркетынгу пад назвай «Жабінкаўскі раён».

Важнай падзеяй для нас быў выхад у свет кнігі мясцовага краязнаўцы Анатоля Бензерука «Наш край – Жабінкаўшчына». Прэм'еру гэтай кнігі з удзелам аўтара правялі ў асноўным усе сельскія бібліятэкі.

Для пашырэння ведаў бібліятэкараў ЦБС пра Беларусь быў арганізаваны краязнаўчы гурток, дзе разглядаліся пытанні гісторыі і культуры Рэспублікі. Заняткі праводзіліся 1 раз у месяц у якасці вытворчай вучобы. Першае пасяджэнне прысвячалася тэме «Этнагенез беларусаў. Фарміраванне беларускай народнасці і культуры». Праграма была складзена такім чынам, каб пазнаёміць членаў клуба з гісторыяй развіцця культуры Беларусі са старажытных  часоў да нашых дзён. Слухачы больш падрабязна даведаліся пра «славутых палачанак», аб вайне 1812 года на Беларусі, упершыню пачулі пра Івана Дамейку, нацыянальнага героя Чылі. Пры правядзенні вечара-партрэта «Давайце пазнаёмімся» слухачы вялі размову пра Т.Касцюшку, К.Каліноўскага, Ю.Крачкоўскага, У.Сыракомлю і іншых. За час правядзення заняткаў слухачы наведалі Бярэсце, Несвіж, Мір, Белавежскую пушчу.

Выяўленыя матэрыялы і атрыманыя веды дапамаглі ў арганізацыі краязнаўчых куткоў у бібліятэках пад назвамі: «Мая Жабінкаўская зямліца», «Слова аб роднай зямлі», «Край мой гістарычны і сучасны». Пачэсную і важную задачу выконваюць бібліятэкі раёна, дапамагаючы вярнуць з нябыту імёны і справы нашых землякоў, чыё жыццё і дзейнасць былі звязаны з родным краем. Так, у Азяцкай сельскай біліятэцы была адкрыта экспазіцыя, прысвечаная Юліану Крачкоўскаму, этнографу, аўтару «Зборніка рускіх народных гімнаў і песень…», «Нарысаў быту заходнярускага селяніна». У Падлескай і Хмелеўскай сельскіх бібліятэках сабраны матэрыялы аб Маркіяну Германовічу, родам з вёскі Дзяменічы, военачальніку, рэпрэсіраванаму ў 1937 годзе. Да 100-годдзя з дня нараджэння У.М.Зубачова, які нарадзіўся ў Жабінцы, праведзена гадзіна гісторыі «Крэпасць вядзе бой». Неблагі матэрыял сабраны пра Т.Касцюшку.

З мэтай вывучэння гісторыі сваёй «малай радзімы» сярод бібліятэк раёна быў аб'яўлены конкурс «Жывая спадчына продкаў». Бібліятэкары сабралі і прадставілі цікавы матэрыял па тэмах: «Традыцыйныя святы, абрады і гульні Жабінкаўшчыны», «Старажытныя стравы Жабінкаўшчыны». Пераможцамі конкурсу сталі Сцяпанкаўская, Падлеская, Хмелеўская сельскія бібліятэкі. Работы, надрукаваныя на мясцовым дыялекце і з густам аформленыя, прыслалі Ракітніцкая, Вежкаўская, Арэпіцкая сельскія бібліятэкі.

У бягучым годзе сярод бібліятэк раёна быў аб’яўлены конкурс “Адкуль у вёскі імя”. Матэрыялы, прадстаўленыя ў аддзел маркетынгу, увайшлі ў буклет пад такой жа назвай.Значнае месца ў рабоце бібліятэк займае адраджэнне традыцый, звычаяў, абрадаў, звязанных з народнымі і рэлігійнымі святамі. Калі раней у асноўным адзначаліся Купалле, Масляніца, то зараз да іх далучыліся Радуніца, Багач, Каляды. Упершыню Пшанайская сельская бібліятэка правяла свята “Саракі”, Мацеевіцская і Якаўчыцкая – “Пасхальныя вячоркі”, Падлеская – “Дзень добры, вербніца”, “Саракі”, “Шчодры вечар, добры вечар”. Каб пазнаёміць чытачоў са спадчынай продкаў, Сцяпанкоўская сельская бібліятэка правяла урок краязнаўства “Беларускія святы і абрады”, Пшанайская – свята “З бабулінага куфэрка”, у многіх бібліятэках праведзены інфармацыйны час “Падарожжа ў мінуўшчыну зямлі Жабінкаўскай”.Цікавай знаходкай з’явілася і правядзенне Арэпіцкай сельскай бібліятэкай “Тыдня беларускай даўніны”. Да тыдня аформлена кніжная выстава “Любіце, знайце свой край”. Першы дзень прысвячаўся тэме “Сімволіка ручніка”, другі дзень – традыцыям беларускага вяселля, трэці – тэме “Крыніца народных прыкмет”, чацвёрты называўся – “Паходжанне назвы Беларусь”, пяты – “Рэцэпты нашых бабуль”, у шосты дзень – праведзена музычная гадзіна з выкананнем беларускіх народных песень.

Шмат цікавых і разнастайных мерапрыемстваў штогод прыўрочваецца да Дня беларускай пісьменнасці і друку. Сярод іх святы кнігі: “Ад прадзедаў спакон вякоў нам засталася спадчына” з удзелам фальклорных калектываў, “Крыніца разумнага, добрага, вечнага”, “Мову родную, край свой любіце”, “Пра час далёкі, летапісны”.

Займаюцца бібліятэкі пошукам рэчаў народнага побыту, вырабаў народных майстроў. У Мацеевіцскай, Крыўлянскай, Падлескай, Вежкаўскай і шэрагу іншых бібліятэк створаны этнаграфічныя куткі. Гэта дае падставу для арганізацыі сустрэч з народнымі майстрамі, якія дзеляцца сваімі сакрэтамі з малодшымі.

У гэтым напрамку асабліва цікавым з’яўляецца вопыт работы Рагазнянскай бібліятэкі-клуба, дзе сабраны багаты этнаграфічны матэрыял, аформлены цікавы і карысны стэнд “Зялёная аптэка”, дзе прадстаўлены лекавыя расліны нашай мясцовасці з анатацыямі аб метадах іх прымянення. Удала спалучаючы формы бібліятэчнай і клубнай работы, бібліятэкар Пугач Л.Ф. праводзіць цікавыя мерапрыемствы, вялікую работу па прапагандзе кнігі і народнай творчасці. Цікавым атрымаўся ў гэтай жа бібліятэцы і ўрок краязнаўства “Ведай спадчыну сваю, беларус”. Бібліятэкар пазнаёміла прысутных з кутком сялянскага быту і этнаграфіі, расказала пра абрадавыя, штодзённыя мужчынскія і жаночыя адзенні, пра стварэнне ручніка, вышыўкі. Расказ таксама быў дапоўнены вершамі беларускіх паэтаў і песнямі.

Сустрэчы з народнымі майстрыхамі ўвайшлі ў практыку работы Падлескай, Азяцкай, Старасельскай бібліятэк.

Працэс адраджэння нацыянальнай культуры нельга разглядаць у адрыве ад творчасці беларускіх пісьменнікаў, якая была пастаянна ў полі зроку бібліятэк. Адбываліся прэзентацыі новых кніг, адзначаліся юбілеі асобных аўтараў, праводзіліся святы беларускай кнігі. Частей сталі звяртацца бібліятэкі раёна да творчасці сваіх паэтаў-землякоў. Не так даўно ў прэсе з’явіліся звесткі пра польскага паэта Альбіна Дзяконскага, які нарадзіўся і некаторы час жыў у Пятровічах. Вершы ён пісаў амаль усё сваё жыццё, і ў Польшчы імя яго вельмі вядома. У Петровіцкай сельскай бібліятэцы аб ім сабраны матэрыял, а у фондзе раённай бібліятэкі ёсць некалькі вершаў А.Дзяконскага.

Асноўная ўвага ўдзяляецца прапагандзе творчасці нашых сучаснікаў. З поспехам прайшлі прэм’еры кніг В.Сахарчука “Даніна”, “Ранішні госць”. Цікавасць у чытачоў выклікалі прадстаўленні кніг А.Каско “45” і Р.Бензерука “Тры свечкі”, дарэчы, гэта яго першая паэтычная кніга, у асноўным ён піша казкі для дзяцей.

На вялікі жаль, да гэтага часу няма друкаванай кнігі выдатных вершаў Васіля Гадулькі, які заўчасна памёр, не выдадзены асобна і творы Івана Дацкевіча, якія нясуць у сабе непаўторны свет чалавечага ўспрымання свету. Жыў у нашым раёне і такі самабытны паэт як Васіль Давідчык, працаваў настаўнікам, быў паляўнічым, пісаў вершы на мясцовым дыялекце.

Але, нягледзячы на недахоп выдадзенай літаратуры, бібліятэкары стварылі недрукаваныя кнігі названых паэтаў, выкарыстоўваюць іх творы пры правядзенні розных мерапрыемстваў. Мясцовыя паэты – пастаянныя ўдзельнікі святаў кніг, пасяджэнняў аматарскіх аб’яднанняў, вечароў паэзіі, сустрэч з чытачамі ў сельскіх бібліятэках раёна.

Вядома, што гэта далёка не ўсе формы і метады работы па выкананню праграмы “Спадчына”, яшчэ не выкарыстаны ўсе магчымасці.

Нам вельмі не хапае добрай краязнаўчай літаратуры, у нас бедны асартымент перыёдыкі, але мы не губляем надзеі на лепшае і спадзяемся, што з дапамогай

бібліятэкі і кнігі мы не станем манкуртамі. Агульна вядома, што нацыя, якая не ведае сваіх каранёў, не мае будучыні.

## ИНФОРМАЦИОННЫЙ ЦЕНТР В БИБЛИОТЕКЕ.

**СИДОРЦЕВА Л.А.**,
*директор Ивановской РЦБС.*

Библиотеке, как социальному институту, изначально присуща информационная функция. Поэтому районная библиотека сегодня является одним из основных информационных центров для населения нашего района.

Мы считаем своей основной задачей - довести до читателей информацию об экономическом и социальном развитии нашего общества.

Для того, чтобы предоставить доступ к информационным ресурсам всем слоям населения, в библиотеке создан «Банк социальной информации». Один из разделов «Банка» – «Ивановский исполнительный комитет: проблемы, решения, перспективы». Цель этого раздела – обеспечить информированность населения о деятельности местных органов власти. В разделе представлены решения и программы районного исполнительного комитета.

С визитными карточками и экономическим положением предприятий и организаций города читателей знакомят материалы в разделах «Предприятия города» и «Социально-культурный комплекс города». Информацию о режиме работы и предоставляемых услугах учреждений социально-культурного комплекса (нотариальной конторы, госстраха, банков, медицинских учреждений) читателям предоставляет раздел «Услуги населению». Для тех, кто ищет работу или желает изменить профессию, предоставлена информация в разделе «Центр занятости информирует».

Переход к формированию рыночной экономики существенно повысил роль права в нашем обществе. Знание гражданско-правовых норм необходимо всем. Каждый должен знать, какие права и свободы предоставлены человеку и гражданину, чтобы осознанно и грамотно добиваться их реализации в различных сферах жизни и деятельности. И в этом нашим читателям помогает «Банк правовой информации», оформленный в читальном зале библиотеки. В разделах «Банка»: «Права человека: декларации и реальность», «Новое в налоговом законодательстве», «Социальная защита населения», «Азбука трудового права» сосредоточены все источники правовой информации - указы и декреты Президента РБ, Ведомости Национального Совета РБ, Законы РБ, Постановления Совета Министров РБ и многие другие нормативные акты правительства РБ.

Наличие «Банков» в библиотеке, позволяет более оперативно и качественно удовлетворять запросы наших читателей.

# УЧЁБА «ПОЧТИ В АМЕРИКЕ…»

**МУХА Т.П.,** *директор*
*Брестской областной библиотеки*
*им. М.Горького*




**ВРЕМЯ:** *24 октября 2000г.*
**МЕСТО:** *Минск, Калининградский переулок,18Б, Американский информационный центр.*
**СЛУШАТЕЛИ:** *директора НБ РБ, республиканских и областных библиотек.*
**ТРЕНЕР:** РОБЕРТ СТЮАРТ, *доктор философии, консультант правительства США, специалист в области*

Наша учёба, общение и дискуссия проходили под общим лозунгом, написанным на экспозиционном экране: «В сегодняшнем мире ничто не постоянно, и ничто не предсказуемо… Сегодняшняя организация развивается под воздействием трёх сил: Клиентов, Конкуренции и Перемен».

Слушая господина профессора, понимаешь, что многие его утверждения применительно к нашим реалиям (экономическим, политическим, социальным) и библиотекам, кажутся в половине их фантастическими. Но любой руководитель как с большим стажем работы, так и недавно пришедший, хорошо знает, как сложно осуществлять в библиотеке перемены. Именно этому вопросу был посвящён семинар и состоял он из двух лекций:

1. Стратегическое планирование в сфере информационных услуг;
2. Адаптация информационных услуг к переменам.

Хотелось бы поделиться с вами некоторыми мыслями господина Стюарта.

Все мы планируем свою деятельность, составляя календарный план работы на год. Стратегическое планирование в идеале рассчитано на 3 года и позволяет:

- мыслить перспективно и разрабатывать эффективные стратегии;
- чётко определить направления движения;
- определить приоритеты.

Иными словами, имея в библиотеке недостаточное финансирование, необходимо определить: что есть приоритет и тратить основную часть денег на то, что является главным сегодня.

Графически это можно изобразить так:



Лишь ответив на все вопросы многоугольника стратегического планирования, можно составлять план действий.

Библиотека находится в процессе изменений. Я думаю, этот тезис не будет оспариваться ни одним из читателей. Ведь интеллектуальная библиотека никогда не бывает в завершённом состоянии. Обозначены три этапа изменений:

- бумажная (традиционная) библиотека;
- автоматизированная библиотека;
- электронная (виртуальная) библиотека.

Чтение для удовольствия остаётся в процессе этих изменений одной из важнейших функций библиотеки. В идеальном состоянии – это равновесие библиотеки как культурного и информационного центра.

Библиотека из хранилища книг превращается в учреждение по предоставлению (продаже) информации, а библиотекарь осуществляет связь между ищущим информацию и источником информации, т.е. становится информационным посредником. И каждый из нас должен хорошо запомнить следующий тезис:

«Информация только тогда имеет ценность, когда искомое и предлагаемое совпадают».

Процесс перемен в библиотеке – это многоплановый и сложный этап работы, и личностный скептицизм является самым трудным фактором в реализации. Существуют плановые и неожиданные перемены. На семинаре шёл разговор о плановых переменах и об одном из сложнейших моментов – о сопротивлении сотрудников этим переменам. Причины сопротивления переменам бывают следующие:

- непонимание перемен;
- недостаточная информированность сотрудников;
- угроза привычным методам работы;
- сотрудники довольны тем, что есть.

Мы хотим перемен или нас заставляет осуществлять перемены реальная объективность? Существует много вариантов мотивации, но руководители библиотек всегда должны помнить, что все наши действия и планы перемен рассматриваются только с точки зрения выгодности для каждого отдельно взятого сотрудника, а значит, и в целом для всей библиотеки.

В заключение семинара каждому из участников был вручён диплом о прослушанном курсе (см. ниже). Информационный центр высказал намерение и впредь работать с этой категорией слушателей, учитывая наши потребности. Поэтому я надеюсь, что система семинаров для руководителей будет продолжаться.

Хотелось бы высказать слова благодарности Марине Шубиной – директору центра информационных ресурсов при посольстве США в Республике Беларусь.





# ПЕРШАЯ ПУБЛІЧНАЯ БІБЛІЯТЭКА
## (*да 170-годдзя Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я.Ф.Карскага)*

**ШЧАРБУК Т.М.,** *вядучы спецыяліст па бібліятэках упраўлення культуры Брэсцкага аблвыканкама.*

Уявіце сябе вандроўнікам, які збіраецца ў падарожжа ў адзін са старажытнейшых гарадоў Беларусі – Гродна. А падставай для гэтага з'явілася адметная падзея ў культурным жыцці рэспублікі – 17 верасня 2000 года Гродзенскай абласной навуковай бібліятэцы імя Я.Ф.Карскага споўнілася 170 гадоў з дня заснавання. Гэта першая публічная бібліятэка на Беларусі і мае яна даволі цікавую гісторыю. Але ўсё па парадку.

Калі набліжацца да Гродна з поўдня, перад намі паўстае высокі правы бераг Нёмана з разнастайнымі забудовамі старога горада, узвышша, дзе нараджаўся, рос і сталеў горад: Стары замак, які ўзнік з дзядзінца XII ст. на Замкавай гары, Новы замак, царква Барыса і Глеба на Калажынскім плата, кляштар бернардзінцаў, насупраць якога абласны драматычны тэатр, у іх падножжа, на самым беразе – піўзавод, ператвораны з палаца Сапегаў, і старыя карпусы тонкасуконнага камбіната (былой тытунёвай фабрыкі Шарашэўскага).

Нас жа больш цікавіць Замкавая гара, да якой вядзе вуліца Замкавая са Старым замкам Стэфана Баторыя XVI ст. на месцы рэзідэнцыі гарадзенскіх князёў, дынастыю якіх заснавалі ў 1116г. Усевалад Давыдавіч і Агаф'я Уладзіміраўна; з XIVст. тут замак Вітаўта. Насупраць Старога – Новы замак XVIIIст. Тут зараз і знаходзіцца частка самай старажытнай з абласных бібліятэк рэспублікі, менавіта: аддзел абанемента, краязнаўства, перыядычных выданняў, інфармацыйна-бібліяграфічнай работы, МБА, адміністрацыя і аддзел бібліятэказнаўства. Астатнія аддзелы размешчаны яшчэ ў чатырох будынках, два з якіх - таксама помнікі архітэктуры: гэта былы жылы дом купца Мураўёва (пач.XX ст.) і дом Э.Ажэшка. У чэрвені б.г. на пасяджэнні Гродзенскага аблвыканкама прынята рашэнне аб праектаванні ў 2001 годзе тыпавога будынка абласной бібліятэкі імя Я.Ф.Карскага, таму ёсць надзея на лепшае.

А пачыналася бібліятэка таксама з рашэння. У верасні 1830 года на нарадзе высокапастаўленых асоб у гродзенскага генерал-губернатара Міхаіла Трафімавіча Бабяцінскага было прынята рашэнне аб адкрыцці ў горадзе бібліятэкі, асновай якой паслужылі дабравольныя ахвяраванні дваран горада. У пратаколе нарады ад 03.09.1830г. адзначаецца: «…Для бібліятэкі павінна быць выбрана месца, у якім бы вільгасць не прыносіла б шкоды кнігам, з дастатковай колькасцю шафаў, каб быў асобны ацяпляемы пакой для прыёму чытачоў. Для загадвання бібліятэкай патрэбна выбраць чыноўніка вопытнага, які ведае навукі. Яго абавязкі: утрымліваць бібліятэку ў неабходным парадку, інфармаваць грамадзянства, губернатара і камітэт аб атрыманых кнігах і інш. …»

Першапачаткова бібліятэкай карысталася ўсяго 40 чалавек, з іх «правасхадзіцельстваў» – 2; «высокаблагародных» – 17; «благародных» – 21. Абслугоўванне было платным, месячны абанемент карыстання фондамі каштаваў 50 капеек.

У 1865г. Міністэрствам унутранных спраў быў зацверджаны Статут бібліятэкі. Кніжны фонд складалі рускія, нямецкія і яўрэйскія выданні, на якія быў складзены каталог.

З 1877г. бібліятэка пачынае атрымліваць урадавую субсідыю ў памеры 800 рублёў у год.

У 1895г. фонд бібліятэкі ўжо налічваў 11 тыс. экзэмпляраў і карысталіся ім 6 тыс. чалавек.

Першым бібліятэкарам Гродзенскай публічнай бібліятэкі быў ксёндз Міхаіл Зелянко, прарэктар гімназіі, сябар вялікага ўкраінскага паэта Тараса Шаўчэнкі. У 1892г. бібліятэку ўзначаліў бацька славутага беларускага паэта Максіма Багдановіча – Адам Ягоравіч, вучоны, педагог і грамадскі дзеяч.

У маі 1940г. адбылося ўрачыстае адкрыццё бібліятэкі для шырокіх слаёў насельніцтва. Кнігі пачалі выдавацца бясплатна. Фонд бібліятэкі ў гэты час складаў 35 тыс. адзінак.

Трагічнымі для бібліятэкі сталі гады Вялікай Айчыннай вайны. Былы супрацоўнік бібліятэкі Мікалай Аляксандравіч Чарвякоўскі так успамінаў першыя дні вайны: «22 чэрвеня ў бібліятэку прыйшлі толькі я і тэхнічка. Дзверы былі зачынены. На другі дзень у Гродна ўвайшлі немцы. Яны занялі памяшканне бібліятэкі. Па загаду фашыстаў была спалена частка кніг, у тым ліку творы рускіх і савецкіх класікаў». Усяго за гады вайны бібліятэка страціла 35 тыс. экземпляраў кніг.

15 лютага 1957 года Гродзенскай абласной навуковай бібліятэцы было прысвоена імя Яўхіма Фёдаравіча Карскага, першага беларускага акадэміка, заснавальніка беларускага мовазнаўства і філалогіі, ураджэнца вёскі Лаша Гродзенскага раёна.

На мяжы трэцяга тысячагоддзя Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага – не толькі буйнейшае ў вобласці кнігасховішча, але і буйнейшы інфармацыйны, адукацыйны і культурны цэнтр рэгіёна. Фонд бібліятэкі налічвае 600 тыс. экземпляраў, больш за 46 тыс. чытачоў штогод карыстаюцца бібліятэкай, ім выдаецца 800 тыс. дакументаў. Акрамя гэтага, бібліятэка з'яўляецца метадычным цэнтрам для 751 бібліятэкі вобласці, штогод рыхтуе звыш 20 творчых прац. Сярод іх: разгорнуты аналітычны матэрыял з дадаткамі «Бібліятэкі Гродзеншчыны за … год», штоквартальны інфармацыйны бюлетэнь «З жыцця бібліятэк вобласці», паказальнік «Літаратура аб Гродзенскай вобласці», «Краязнаўчы каляндар» з дадаткамі, прысвечанымі знакамітым людзям вобласці.

У 1993г. бібліятэка прыступіла да стварэння аўтыматызаванай інфармацыйна-бібліяграфічнай сістэмы, а напярэдадні свайго 170-гадовага юбілею атрымала Грант з Фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Г.Лукашэнка па падтрымцы культуры і мастацтва за праект «Аўтаматызацыя бібліятэчных працэсаў у Гродзенскай абласной навуковай бібліятэцы імя Я.Ф.Карскага».

Але асноўнае багацце бібліятэкі – яе супрацоўнікі. Сёння ў бібліятэцы працуе зладжаны, высокапрафесійны, творчы калектыў, налічваючы 120 чалавек. Усё сваё майстэрства, веды, натхненне і талент аддаюць яны сваім наведвальнікам-чытачам дзеля павышэння іх адукаванасці, развіцця духоўнасці і культуры, захоўваючы пры гэтым галоўнае прызначэнне першай публічнай бібліятэкі – зберажэнне і папулярызацыю нацыянальнай спадчыны.

Грунтуючыся на лепшых традыцыях мінулага і ўкараняючы ў практыку работы ўсё новае і перадавое, Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага ўпэўнена крочыць у трэцяе тысячагоддзе.*

Святочныя мерапрыемствы з нагоды 170-годдзя Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я.Ф.Карскага распачаліся навукова-практычнай канферэнцыяй «Бібліятэка – жывая гісторыя стагоддзяў».

*Швед В., Госцеў А. Гродна: мінулае ў сучасным. – Гродна, 1999. –12с.: іл.;
Мальцава Л. і інш. Гродзенская абласная навуковая абласная бібліятэка імя Я.Ф.Карскага. – Гродна, 2000. – 20с. з фотазд.

Даклады, выступленні, паведамленні, зробленыя навукоўцамі, краязнаўцамі і афіцыйнымі асобамі г.Гродна, былі настолькі адметныя і неардынарныя, што выклікалі цікавасць не толькі ў спецыялістаў (дырэктараў ЦБС Гродзеншчыны, абласных бібліятэк рэспублікі, супрацоўнікаў Міністэрства і ўпраўленняў культуры рэспублікі, Нацыянальнай бібліятэкі), але і шматлікіх гасцей. Вось тэмы некаторых з іх: «Рукапісныя кнігі Гродзеншчыны» - прафесара, кандыдата філалагічных навук, загадчыка кафедры ГрДзУ імя Я.Купалы Пяткевіча А.М.; «Развіццё бібліятэчнай справы на Гродзеншчыне ў XII-XIXст.ст.» - гісторыка архітэктуры, краязнаўца Трусава І.Г.; «Старэйшыя бібліятэкі Гродзеншчыны» - кандыдата гістарычных навук, дацэнта кафедры гісторыі Беларусі ГрДзУ імя Я.Купалы Марозава С.В. і інш.

Потым была экскурсія па Новым замку, у якім размешчана бібліятэка. Высокія столі, мармуровыя лесвіцы, жэрандолі, зробленыя па заказу ў Вільні, напаміналі, што будынак бібліятэкі незвычайны – помнік архітэктуры XVIII ст. Дарэчы, кабінет дырэктара бібліятэкі – мілавіднай і абаяльнай Лідзіі Васільеўны Мальцавай, знаходзіцца ў былой спачывальні. А якія краявіды адкрываюцца з вокан гэтага пакоя!

Урачыстая вечарына была наладжана ў малой зале абласнога драматычнага тэатра. Столькі кветак, падарункаў, узнагарод, віншаванняў, цёплых слоў атрымала бібліятэка і яе супрацоўнікі, напэўна, упершыню за 170 гадоў. Разам з дыктарамі абласнога тэлебачання ўсе прысутныя зрабілі завочнае падарожжа па аддзелах бібліятэкі, бліжэй пазнаёміліся з яе супрацоўнікамі, шэраг з якіх за сваю высокародную працу атрымалі ўзнагароды: Ганаровыя граматы Міністэрства культуры, Федэрацыі прафсаюзаў, аблвыканкама, гарвыканкама, упраўлення культуры, абкама прафсаюзаў работнікаў культуры. Дырэктар бібліятэкі Мальцава Л.В. была ўзнагароджана Ганаровым знакам Міністэрства культуры.

Атмасферай чысціні, дабрыні, любові, прызнання, усхвалення кнігі і гэтых сціплых, высокаадукаваных, інтэлігентных жанчын – бібліятэкараў былі прасякнуты ўсе наладжаныя мерапрыемствы. Свята Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я.Ф.Карскага і яе супрацоўнікаў вылілася ў свята бібліятэк вобласці, у свята чытачоў.

У наступны дзень мы ў гэтым упэўніліся, наведаўшы дзве цудоўныя сельскія бібліятэкі Гродзенскай раённай ЦБС: Верцялішанскую і Абухаўскую. Гэтыя бібліятэкі ўваходзяць, як кажуць у нас на Брэстчыне, у «залатое кальцо» і з'яўляюцца, ў першую чаргу, базавымі для абласных курсаў павышэння кваліфікацыі сельскіх бібліятэкараў вобласці, аб'ектамі паказа шматлікім дэлегацыям, месцамі практыкі студэнтаў - будучых бібліятэкараў. Апантаныя людзі працуюць у гэтых бібліятэках. Яны добра ведаюць не толькі кнігі, але і праблемы вёскі, калгаса, любяць сваю справу і чытачоў.



## ДЕЛУ КНИЖНОМУ СЛУЖИМ…

**ПАШКЕВИЧ Л.С.,** *зав. отделом домашнего абонемента Брестской областной библиотеки им. М.Горького*

Отдел домашнего абонемента.
Третья слева стоит
Л.С.Пашкевич.

Если театр начинается с вешалки, то библиотека - конечно же, с абонемента. Отдел домашнего абонемента – это один из самых крупных отделов областной библиотеки им. М.Горького. Сегодня в нём работают 12 человек. Профессия библиотекаря – одна из немногих, которая не позволяет оставаться в стороне от бурных событий времени, требует постоянного пополнения уровня знаний, духовного обогащения. Коллектив работников отдела домашнего абонемента очень сплочённый, многие сотрудники имеют большой стаж библиотечной работы, но, несмотря на приобретённый опыт, не останавливаются на достигнутом, а находятся в постоянном поиске.

«Библиотекарь – это звание и состояние души». Именно состояние души. Потому что в отделе работают люди, по-настоящему влюблённые в свою профессию. Специфика работы отдела абонемента заключается в общении с различными категориями читателей (от учащихся школ до пенсионеров). И, например, обслуживание такой категории читателей как пенсионеры требует от библиотекаря особенных человеческих и профессиональных качеств. Приходит в отдел читатель, и сразу перед тобой открывается целый мир. Он идёт к нам со своими мыслями, чувствами, настроением, ожиданием встречи с любимой книгой, с желанием найти что-то важное по нужной теме. И библиотекарь должен решить ряд задач: помочь человеку, подарить ему радость общения с хорошей книгой, а в дальнейшем научить самостоятельно искать и подбирать нужные издания. С этим прекрасно справляются главный библиотекарь Л.Сахаревич, библиотекари Т.Климук, Т.Грициенко, Н.Ревенко, Н.Крутько.

Если говорить о функциональных обязанностях работников отдела, то они распределяются в зависимости от годового плана работы. Организация и подготовка массовых мероприятий и книжных выставок, работа по сохранности книжного фонда, беседы с читателями-должниками, анализ картотеки отказов, участие в процессе комплектования, в реализации библиотечных программ, - вот некоторые основные

служебные обязанности сотрудников отдела домашнего абонемента. Но самой главной задачей для себя мы считаем полное, качественное и оперативное обслуживание читателей.

Услугами нашего отдела пользуются 10000 читателей. Ежедневно абонемент посещают около 300 человек, в т.ч. из них впервые приходят 20-25. В 1999 г. нас посетило почти 80000 человек. Наши читатели – люди разного возраста, образования, запросов. Структура читательской аудитории складывается из постоянных пользователей – тех, кто посещает абонемент один – два раза в месяц. Есть сверхактивные – посещающие нас два-три раза в неделю. Но вместе с тем присутствует и категория пассивных, разовых читателей, которые приходят всего один-два раза в год. Самый большой читательский поток – это студенты Брестского педагогического университета и учащиеся школ. И это самая острая проблема на сегодняшний день в нашем отделе. В последнее время абонемент работает исключительно на обслуживание учебного процесса студентов и учащихся. В связи с этим в отделе, и в библиотеке в целом, установилось такое положение, когда невозможно соответствующим образом организовать процесс обслуживания читателей и обеспечить сохранность книжных фондов. И наша администрация вынуждена была пойти на такую непопулярную меру как ограничение записи в библиотеку студентов первых курсов и перераспределение читателей-учащихся в детское отделение областной библиотеки. Но впоследствии от этого пришлось отказаться из-за возникшего потока жалоб. В Бресте открываются новые негосударственные вузы, факультеты в государственных институтах, лицеи, гимназии, техникумы. И все они, как правило, не имеют своих собственных библиотек. А поэтому основная масса учащихся и студентов идёт в областную библиотеку. И как бы мы ни регулировали читательский поток, количество пользователей растёт из года в год. Поэтому решение этой проблемы мы видим только в одном: в городе назрела настоятельная необходимость создания юношеской публичной библиотеки, которая обеспечивала бы учебный процесс.

Рост количества читателей обостряет такую проблему как должники. Уже много лет отдел активно ведёт работу по ликвидации читательской задолженности. Основой является картотека должников и ежегодно проводимая акция «Неделя возвращённой книги». Ежегодно в декабре абонемент составляет списки должников и передаёт их в отдел регистратуры и контроля с тем, чтобы на момент перерегистрации читателей те, кто задолжали книги, сначала рассчитались с задолженностью, а потом уже могли пользоваться читальными залами. За время работы в таком режиме ликвидирована задолженность почти у 2000 человек. Считаем, что эта проблема может быть решена только в том случае, если государство вновь возьмёт на себя обязанность по взысканию 10-, 5- или хотя бы 3-кратной стоимости книг через судебные органы.

Ежегодное увеличение количества читателей обостряет проблему сохранности книжных фондов. Сегодня наш фонд – это 80000 экз. книг, брошюр, газет и журналов по различным отраслям знаний. С 1994 г. отдел перешёл на работу с ограниченным доступом читателей к фонду. Фонд закрыт на 90%, что усложнило и приблизило работу абонемента к читальным залам, когда за каждой книгой нужно идти в подсобный фонд. Увеличение читателей привело к необходимости создания в отделе рабочего места дежурного библиотекаря, в функции которого входит регулирование читательского потока, поддержание порядка, осуществление контроля за сохранностью книжного фонда.

Говоря о фонде, нельзя не сказать о том, какая же литература пользуется наибольшей популярностью. Предпочтение отдаётся художественной книге: современной отечественной и зарубежной. Продолжает оставаться устойчивым интерес к таким жанрам как исторический роман, детектив, семейно-бытовая и любовная проза. Широко распространено чтение литературно-художественных и информационно-развлекательных журналов («Новый мир», «Москва», «Нева», «Домашний очаг», «Крестьянка», «Алеся»). В десятку наиболее читаемых авторов вошли Д.Чейз, А.Маринина, В.Воронин, П.Дашкова, Б.Картленд, Н.Леонов, Д.Корецкий, Ж.Бенцони, Д.Стил, С.Браун. Спрос на

отраслевую литературу связан прежде всего с учебным процессом (литература юридического, экономического, педагогического, исторического содержания) или с любительскими занятиями (шитьём и вязанием, выращиванием овощей и фруктов на приусадебных участках, рыболовством, охотой, кулинарией). Значительное количество тематических запросов поступает по вопросам политологии, экономики, социологии. Заметно возрос интерес к исторической литературе, в основном по истории Белоруссии и об отдельных исторических личностях. Среди авторов, изучаемых в учебном процессе, наиболее спрашиваемыми являются: Ч.Айтматов, В.Астафьев, М.Булгаков, А.Блок, С.Есенин, В.Распутин, А.Твардовский.

Но для того, чтобы все эти библиотечные богатства сохранились и для читателей других поколений, нужно чтобы нынешний читатель бережно и серьёзно относился к книгам. Ведь новых поступлений с каждым годом становится всё меньше. В 1999 г. на каждого читателя абонемента пришлось всего 0,28 новых книг. Вызывает тревогу и озабоченность ситуация с профессиональными кадрами. Из 12 работников абонемента только 5 имеют высшее библиотечное образование. Нынешних выпускников университета культуры не прельщает профессия библиотекаря с мизерным окладом, отсутствием элементарного жилья, двухсменным рабочим графиком, рабочими субботами и воскресеньями. Но, несмотря на всё это, мы не теряем оптимизма и продолжаем надеяться на лучшее. А наиболее перспективными направлениями работы для себя считаем следующие:

- качественное комплектование фонда отдела, расширение репертуара новых поступлений книг и периодических изданий;
- индивидуальное информирование новых читателей о возможностях областной библиотеки в целом, и отдела абонемента в частности (знакомство с правилами пользования, с юбилейным буклетом о Брестской областной библиотеке им. М.Горького, устные беседы);
- оформление в целях рекламы информационного щита в отделе домашнего абонемента (со сведениями о количестве и составе фонда, принципах его формирования, каталогах, круге предлагаемых услуг, планируемых мероприятиях, изменениях в «Правилах пользования библиотекой» и др);
- включение библиотек в список организаций, которые могут взыскивать с должников 10-кратную стоимость через судебные органы.

## *ПОЗДРАВЛЯЕМ КОЛЛЕКТИВЫ*



**ПРУЖАНСКОЙ ЦРБ им. М.ЗАСИМА**
**и**
**БРЕСТСКОЙ ЦГБ им. А. ПУШКИНА**

**С 60-ЛЕТНИМ ЮБИЛЕЕМ!**

**ПОЗДРАВЛЯЕМ ЮБИЛЯРОВ:**

***РОМАНЮК АЛИСУ ВАСИЛЬЕВНУ -***
***директора Брестской ГЦБС,***

***ВОЛУЕВИЧ ТАМАРУ АЛЕКСАНДРОВНУ -***
***директора Ганцевичской РЦБС,***

**ГУНЬКО ГАЛИНУ МИХАЙЛОВНУ –**
***зам. директора Столинской РЦБС,***

**ЛЕЛЕС ЕЛЕНУ ДАНИЛОВНУ –**
***зав. отделом библиотечного маркетинга Ганцевичской РЦБС,***

**САВИЛОВИЧ ТАМАРУ ВАСИЛЬЕВНУ –**
***зав. отделом библиотечного маркетинга Пинской РЦБС,***

**ЯРМАК ГАЛИНУ НИКОЛАЕВНУ –**
***зав. отделом библиотечного маркетинга Каменецкой РЦБС,***

**САВОНЧИК ТАТЬЯНУ АЛЕКСАНДРОВНУ –**
***главного библиотекаря отдела библиотечного маркетинга Столинской РЦБС.***

*ЖЕЛАЕМ ЗДОРОВЬЯ, УСПЕХОВ, ДОБРА,*

# НАСУСТРАЧ ЮБІЛЕЮ: РЭДЗІГЕРАЎСКАЙ СЕЛЬСКАЙ БІБЛІЯТЭЦЫ ЛУНІНЕЦКАЙ РЦБС – 55.

**РАДЗІАНОВІЧ Н.М.,**
*дырэктар Лунінецкай РЦБС,*
**ПАЎЛЮКАВЕЦ Г.М.,**

***галоўны бібліятэкар аддзела бібліятэчнага маркетынгу Лунінецкай РЦБС.***

У 2000 годдзе Рэдзігераўская сельская бібліятэка Лунінецкай РЦБС Брэсцкай вобласці адзначае свой юбілей – 55-годдзе з дня заснавання. Працуе тут бібліятэкарам Паўлоўская Нюра Паўлаўна ужо 30 гадоў і шмат часу аддае рабоце.

Вялікую ўвагу надае яна "Летапісу" сваёй бібліятэкі. Гэта яе намаганнямі ўстаноўлены імёны ўсіх бібліятэкараў, аформлены альбом, у якім змешчаны фотаздымкі і ўспаміны, расказ аб далейшым лёсе ўсіх былых работнікаў бібліятэкі. Дарэчы, на раённым узроўні "Летапіс" прызнаны лепшым і ўзнагароджаны Дыпломам І ступені. З задавальненнем расказвае Нюра Паўлаўна пра сваіх папярэднікаў. Першым бібліятэкарам была Марыя Максімаўна Гаўрылюк, без спецыяльнай адукацыі, але вялікі энтузіяст сваёй справы. М.М.Гаўрылюк успамінае, што бібліятэка, ці, як яна тады называлася, хата-чытальня, пачала працаваць у другой палове 1945 года і размяшчалася разам з сельскім Саветам у хаце Працука Маісея Ксенафонтавіча. Кніжны фонд складаў тады каля 100 экзэмпляраў.

Яшчэ аддзін цікавы факт з гісторыі бібліятэкі. Міхаіл Васільевіч Лук'яновіч з Сінкевіч, Сцяпан Міхайлавіч Быстры і Лідзія Аляксееўна Ляшчук з Рэдзігерава сумесна вялі драматычны гурток пры бібліятэцы. У 1956г. у конкурсе п'ес занялі прызавое месца са сваей пастаноўкай "Шчасце трэба абараняць".

З 1945г. па 1969г. у сельскай бібліятэцы змянілася шмат работнікаў. А з 1969г. у Рэдзігераўскай сельскай бібліятэцы пачала працаваць Н.П.Паўлоўская.

Сёння гэта бібліятэка з'яўляецца адной з лепшых у Лунінецкім раёне. Яе кніжны фонд налічвае 12700 экз. кніг. У 1999г. бібліятэка абслужыла 500чытачоў, было выдадзена 10000 экз. кніг.

Асноўнымі напрамкамі дзейнасці з'яўляюцца пошук і ўкараненне новых форм работы з чытачамі, адраджэнне народнай спадчыны, папулярызацыя краязнаўчых і эстэтычных ведаў, беларускай літаратуры.

Пры бібліятэцы працуе аматарскае аб'яднанне "Юны натураліст" па папулярызацыі прыродазнаўчай літаратуры. Удзельнікі клуба знаёмяцца з флорай і фаунай свайго рэгіёна, праблемамі экалогіі, закранаюцца чарнобыльскія пытанні. Цікава прайшлі гадзіны экалогіі "Зямля – мой лёс" і "Азбука беражлівасці", турнір знаўцаў "Што ў лесе расце, хто ў лесе жыве", літаратурна-музычная вечарына "Зямля ў нас адна". Аформлены кніжныя выставы "Прырода і чалавек", "Чарнобыль.Трагедыя. Мужнасць", тэматычная папка вершаў аб прыродзе мясцовага паэта В.А.Мяшкова. Шмат цудоўнага робяць гурткоўцы сваімі рукамі. Стаяць на паліцах розныя вырабы. Здаецца, што гэта – маўклівы, застылы свет, але ў ім хаваюцца жыццё і рух. Варта да іх дакрануцца, як адбудзецца дзіва: вашаму позірку адчыніцца дарога ў казачную краіну. Гэта краіна не падобна ні на якую іншую. У яе свой твар, свае фарбы, гукі і тайны. Гэта краіна завецца "Творчасць". Тут ёсць усё – ад "сапраўдных" грыбоў з гліны да фантастычнай птушкі. Мова гэтай краіны незвычайная – мова творчасці, якая расказвае аб прыгажосці навакольнага свету.

Значная ўвага надаецца эстэтычнаму выхаванню моладзі і падлеткаў.

Для школьнікаў тут праводзяцца літаратурныя вандроўкі і вечарыны, тэатралізаваныя шоў, пазнавальныя гадзіны і міні-віктарыны, конкурсы, гадзіны этыкету.

Традыцыйна праводзіцца Тыдзень дзіцячай кнігі. Адкрыццё тыдня – заўсёды свята не толькі для дзяцей, а і для ўсіх жыхароў. "Кніжчыных імянін" чакаюць дзеці з нецярплівасцю, таму што ведаюць, што будзе шмат цікавага: тэатралізаванае прадстаўленне, конкурсы, вясёлыя літаратурныя гульні, песні. У мінулым годдзе на сустрэчу да рабят прыйшлі казачныя героі: Іван Царэвіч, Васіліса Прэмудрая, Алёнушка і Ямеля. Пабывалі яны ў царстве Кашчэя, у хаце Бабы Ягі, пагасцілі ў Дамавога, паслухалі песні і казкі вучонага Ката. Свята настолькі захапіла дзяцей, што ўвесь дзень яны правялі ў бібліятэцы і ў Доме культуры, "падарожнічалі" па кнігах.

Любоў да кнігі і чытання, да бібліятэкі Н.П.Паўлоўская прывівае дзецям з дашкольнага ўзросту. Яна прываблівае малышоў у бібліятэку і стараецца, каб яны сталелі ў сяброўстве з добрай кнігай. Работа гэта, планамерная і сістэматычная, праводзіцца ў цесным кантакце з дзіцячым садком і са школай. Урокі бібліятэчных ведаў для вучняў пачатковых класаў праходзяць як падарожжы ў Кнігаград, "У госці да Айбаліта" і інш. Іншы раз рыхтуюцца тэатралізаваныя прадстаўленні ці ранішнікі.

Паважаюць Н.П.Паўлоўскую мясцовыя жыхары і чытачы. Нават паэт-зямляк В.Мяшкоў прысвяціў бібліятэкару свой верш "Хозяйка".

У бібліятэцы праводзіцца шмат цікавых мерапрыемстваў у перыяд месячніка "Што можа бібліятэка", месячнікаў па рабоце з беларускай і краязнаўчай літаратурай, з пажылымі людзьмі.

Рэдзігераўская сельская бібліятэка прымала ўдзел у раённым аглядзе-конкурсе на лепшую пастаноўку работы па экалагічнаму выхаванню, экалагічнай адукацыі і інфармацыі насельніцтва.

У 1996 годзе бібліятэкар Н.П.Паўлоўская ў сваім раёне атрымала ганаровае званне "Бібліятэкар года – 96". І сёння мы з задавальненнем віншуем бібліятэку з яе святам.

***АДДЗЕЛ БІБЛІЯТЭКАЗНАЎСТВА АБЛАСНОЙ БІБЛІЯТЭКІ ІМЯ М.ГОРКАГА З ЗАДАВАЛЬНЕННЕМ ДАЛУЧАЕЦЦА ДА ВІНШАВАННЯЎ І ЖАДАЕ НЮРЫ ПАЎЛАЎНЕ ПАЎЛОЎСКАЙ АДЗНАЧЫЦЬ НА СВАЁЙ ПАСАДЗЕ 110-ГОДДЗЕ РЭДЗІГЕРАЎСКАЙ СЕЛЬСКАЙ БІБЛІЯТЭКІ ЛУНІНЕЦКАЙ РЦБС!***

# З М Е С Т

## БЮРО ІНФАРМАЦЫІ


КЛЮЕВ В.К. БИБЛИОТЕЧНАЯ МИКРОЭКОНОМИКА (методология, менеджмент, маркетинг, дидактика) ________________________________с.1 – 7

РАЧКОВСКАЯ Л.И. О РАБОТЕ БИБЛИОТЕК БРЕСТСКОЙ ОБЛАСТИ в I-ом полугодии 2000г.____________________________________________с.8 - 14

МЯСНЯНКИНА А.М. «БИБЛИОТЕКОВЕДЕНИЕ»: журнал для профессионалов _______________________________________с.15-17

ШЭЙКА Н.А. АНАЛІЗ ВЫДАВЕЦКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ бібліятэк Брэсцкай вобласці.________________________________________с.18-20

КОРОЛЬ Л.К. ОБ ИТОГАХ ОБЛАСТНОГО МЕСЯЧНИКА популяризации периодических изданий для детей и подростков._______с.21-22


## *ЖАДАНЫ ГОСЦЬ*


НОВІКАВА Т.М. КНІГІ Ў ЗБОРЫ БРЭСЦКАГА МУЗЕЯ.____________________с.23-24


## *ПАСЛЯ БАЛЮ…*


БУРИНА Г.И. «PUBLIC RELATIONS» ПО-БРЕСТСКИ: уроки одного юбилея.______________________________________________ с.25-33


## *МАЙСТАР-КЛАС*


ІВАНОВА М.В. ВЕДАЦЬ, ПАМЯТАЦЬ, ЗАХОЎВАЦЬ. Мэтавая краязнаўчая праграма «Бацькаўшчына» – у дзеянні.__________с.35-37

ЧЕРЕВКО И.Д. «ЧТОБ НЕ ПРЕРВАЛАСЬ ЖИЗНИ НИТЬ…»_______________с.38-40

ЕПІШКА Т.А. УДЗЕЛ СЕЛЬСКІХ БІБЛІЯТЭК У ВЫКАНАННІ комплекснай праграмы “Спадчына”__________________________________с.41-43

СИДОРЦЕВА Л.А. ИНФОРМАЦИОННЫЙ ЦЕНТР В БИБЛИОТЕКЕ._________с.44

***ШЛЯХАМІ ДАЛЬНІХ ВАНДРАВАННЯЎ***

МУХА Т.П. УЧЁБА «ПОЧТИ В АМЕРИКЕ…»____________________с.45-46

ШЧАРБУК Т.М. ПЕРШАЯ ПУБЛІЧНАЯ БІБЛІЯТЭКА.____________с.47-49

***ХТО ЁСЦЬ ХТО Ў АБ?***

ПАШКЕВІЧ Л.С. ДЕЛУ КНИЖНОМУ СЛУЖИМ…_______________с.50-52

***ПРЫМІЦЕ НАШЫ ВІНШАВАННІ!***

ВІНШАВАННІ ЮБІЛЯРАМ __________________________________с.53-55

**На І-ай старонцы вокладкі: ФРАГАНАР ЖАН АНАРЭ. ДЗЯЎЧЫНА, ЯКАЯ ЧЫТАЕ. Каля 1776г. Палатно, алея. 81 ✕65см. Вашынгтонская нацыянальная галерэя.**

**Выпуск БП-3  падрыхтаваны**
**аддзелам бібліятэказнаўства**
**Брэсцкай абласной**
**бібліятэкі** імя **М. Горкага**
**Мастацкае выкананне эмблемы** ***А.Федатоўскай, М.Савіча.***
***Лістапад, 2000.***

**224016  г.Брэст, б.Касманаўтаў, 48.**
**☎ 23-21-20**